# КРЭДА ЖЫЦЦЯ

70 БССР КПБ

### Вільгельм Георгіевіч Кнорын: — Ні ў чым не маю патрэбы, акрамя часу для работы

У пачатку верасня 1917 года бальшавікі ўнеслі прапанову аб перавыбранні Савета. У працэсе перавыбараў у яго ўвайшлі 184 бальшавікі. Поўнасцю бальшавіцкім стаў і прэзідыум Савета, сакратаром якога і намеснікам старшыні быў выбраны В. Г. Кнорын. А 5—7 кастрычніка ў Мінску сабралася II надзвычайная Паўночна - Заходняя абласная канферэнцыя РСДРП(б). Яна выбрала абласны камітэт партыі, у састаў якога ўвайшоў і В. Г. Кнорын, зацвердзіла яго адным з рэдактараў газеты «Буравеснік», створанай замест закрытай Часовым урадам газеты «Молат».

Пасля заканчэння работы II Паўночна - Заходняй абласной канферэнцыі Вільгельм Георгіевіч наведаў ЦК РСДРП(б) і праінфармаваў яго аб рабоце і рашэннях канферэнцыі, становішчы на Заходнім фронце і падрыхтоўцы да ўзброенага паўстання. 10 кастрычніка 1917 года ЦК РСДРП(б) заслухаў даклад Я. М. Свярдлова аб становішчы на Заходнім фронце, у аснову якога была пакладзена інфармацыя В. Г. Кнорына. Ён накіраваў у Беларусь 76 агітатараў, якія актыўна ўключыліся ў работу па падрыхтоўцы мас да паўстання. А. Ф. Мяснікоў і В. Г. Кнорын актыўна ўдзельнічалі ў стварэнні атрадаў Чырвонай гвардыі. Раніцай 25 кастрычніка «Буравеснік» выйшаў з адозвай, якую напісаў В. Г. Кнорын. У ёй гаварылася:

— Нам трэба спыніць грабежніцкую вайну, прапанаваўшы дэмакратычны мір! Нам трэба адмяніць памешчыцкае права на зямлю, перадаць усю зямлю без выкупу сялянскім камітэтам! Нам трэба знішчыць голад, перамагчы разбурэнне і паставіць рабочы кантроль над вытворчасцю і размеркаваннем! Таму наша першае патрабаванне: «Уся ўлада Саветам!».

25 кастрычніка 1917 года Мінскі Савет атрымаў тэлеграму Петраградскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, у якой паведамлялася аб звяржэнні Часовага ўрада. А. Ф. Мяснікоў, В. Г. Кнорын і К. І. Ландар выдалі загад № 1 аб пераходзе ўлады ў Мінску ў рукі Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Вечарам 25 кастрычніка кіруючыя работнікі Мінскага Савета з дапамогай байцоў 1-га рэвалюцыйнага палка ўстанавілі кантроль на пошце, тэлеграфе, радыёстанцыі, вакзале і іншых важных аб'ектах горада. А 27 кастрычніка пры Мінскім Савеце быў створаны Ваенна-рэвалюцыйны камітэт. У яго ўвайшлі А. Ф. Мяснікоў, В. Г. Кнорын, К. І. Ландар і іншыя.

Усяго сто дзён пратрымалася Савецкая ўлада ў Беларусі, але кожны з іх быў звязаны з неймавернымі цяжкасцямі ў барацьбе супраць контррэвалюцыі. У такім становішчы абласны камітэт партыі перайшоў на канспіратыўную кватэру, дзе разам з прэзідыумам Мінскага Савета, Ваенна - рэвалюцыйным камітэтам Заходняга фронта па прапанове В. Г. Кнорына было прынята рашэнне аб уступленні ў перагаворы з «камітэтам выратавання рэвалюцыі», утвораным контррэвалюцыянерамі на чале са стаўленікам Часовага ўрада Ждановым. Гэты манеўр быў зроблены, каб не дапусціць адпраўлення контррэвалюцыйных сіл у Маскву і Петраград, выйграць час для падаўлення контррэвалюцыі.

У крытычны момант В. Г. Кнорын і А. Ф. Мяснікоў звярнуліся да казакаў з заклікам вярнуцца ў казармы і не выступаць супраць Савецкай улады, збіраць свае сілы для нанясення ўдару «камітэту выратавання рэвалюцыі». У ноч з 1 на 2 лістапада ў Мінск прыбылі воінскія часці, з дапамогай якіх «камітэт выратавання» быў разгромлены. Зноў зацвердзілася ўлада Саветаў. Вільгельм Георгіевіч разам з А. Ф. Мясніковым, К. І. Ландарам, І. Е. Любімавым і іншымі бальшавікамі праводзіў актыўную работу па барацьбе з бандай Доўбар-Мусніцкага і іншымі контррэвалюцыянерамі, наладжванню выхаду газеты «Звязда», рэарганізацыі школ і паляпшэнню харчовага забеспячэння насельніцтва Мінска і Беларусі.

Але становішча ўскладнялася тым, што германскі ўрад перапыніў мірныя перагаворы і 18 лютага 1918 года рушыў свае войскі ў наступленне. У гэты ж дзень старшыня Мінскага гарадскога камітэта партыі В. Г. Кнорын сустрэўся з групай бальшавікоў, якая павінна была застацца ў Мінску ў выпадку яго акупацыі, і даў інструктыўныя ўказанні па арганізацыі падпольнай работы. У ноч з 18 на 19 лютага 1918 года было прынята рашэнне аб эвакуацыі. В. Г. Кнорын у ліку іншых кіраўнікоў Аблвыкамзаха, Паўночна - Заходняга абласнога і Мінскага гарадскога камітэтаў партыі пакідаў горад апошнім.

23 лютага 1918 года на аб'яднаным пасяджэнні Заходняга абласнога і Смаленскага камітэтаў РСДРП(б) была прынята рэзалюцыя ў падтрымку заключэння міру. Вырашана таксама прыступіць да выдання газеты «Звязда», рэдактарам якой стаў В. Г. Кнорын.

На IV Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі ў Смаленску, якая адбылася ў чэрвені 1918 года, В. Г. Кнорын выбран сакратаром абласнога камітэта партыі. Яму ж даручалася і кіраўніцтва дзейнасцю падпольных арганізацый на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. У сваіх артыкулах у «Звяздзе» таго часу ён выкрываў эсэраў, даваў дакладныя адказы на хвалюючыя сялян пытанні. Пры яго актыўным удзеле адкрываліся новыя школы, падбіраліся кадры настаўнікаў, у вёску пасылаліся кнігі, газеты.

На V Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі В. Г. Кнорын выступіў з дакладам аб дзейнасці абкома, і яна аднадушна зацвердзіла прапанаваны ім праект пастановы аб партыйнай дысцыпліне. У кастрычніку В. Г. Кнорын, І. Я. Алібегаў і іншыя таварышы прымалі ўдзел у канферэнцыі камуністычных арганізацый Польшчы, Беларусі, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Фінляндыі, якая была склікана ЦК РКП(б) у Маскве. А 24 лістапада 1918 года на пасяджэнні абкома В. Г. Кнорын далажыў аб выніках канферэнцыі. У Смаленску была адкрыта партыйная школа, дзе Вільгельм Георгіевіч чытаў курс гісторыі партыі. Шмат увагі ён удзяляў павышэнню баявога майстэрства

Са справаздачным дакладам выступіў В. Г. Кнорын. Ён падкрэсліў выключна важную ролю самавызначэння Беларусі і выказаў упэўненасць у тым, што ўтварэнне Беларускай ССР яшчэ больш згуртуе рускі і беларускі народы ў адзіную дружную сям'ю.

Канферэнцыя аднадушна абвясціла ўтварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі, аб'явіла сябе I з'ездам

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

М. ЛЯШКО, кандыдат гістарычных навук.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь